## САМАСТОЙНАЯ ПРАЦА ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

***Н.М. Якшына*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – Н.І. Новік-Шчарбенка, канд. філал. навук, дацэнт

Арганізацыя самастойнай працы малодшых школьнікаў на ўроках літаратурнага чытання з'яўляецца важнейшай праблемай навучальна-выхаваўчага працэсу. Сёння, калі ўзровень развіцця вучня вызначаецца і ацэньваецца яго здольнасцю самастойна набываць новыя веды і ажыццяўляць іх перанос у новую, незнаёмую сітуацыю, дзейнасць настаўніка павінна быць скіравана на арганізацыю самастойнай працы ў навучальным працэсе, пачынаючы з пачатковай школы, паколькі ў малодшым школьным узросце адбываецца станаўленне такіх якасцей асобы, як самастойнасць, адказнасць, здольнасць да самакантролю. Самастойная праца школьнікаў на ўроку – адзін з самых даступных і правераных на практыцы шляхоў актывізацыі вучнёўскай дзейнасці. Выкарыстанне самастойнай працы дазваляе выявіць інтэлектуальна-пазнавальныя і творчыя здольнасці вучняў.

Праблема арганізацыі самастойнай працы цікавіла і цікавіць такіх вядомых метадыстаў і педагогаў-практыкаў, як П.І. Підкасісты, М.А. Лазарук, В.Я. Ляшук, А.В. Руцкая, М.І. Верціхоўская, І.Ф. Харламаў. Педагагічная практыка паказвае, што навучальны патэнцыял павялічваецца, калі школьнікі працуюць самастойна, а настаўнік кіруе іх дзейнасцю, дае неабходныя тлумачэнні і кансультацыі, развівае здольнасць самастойна мысліць, дакладна і пераканаўча выказваць свае думкі, весці спрэчку.

Як адзначаюць метадысты, на ўроках у школе не заўсёды можна ўбачыць прадуманую сістэмную арганізацыю самастойнай працы. Часцей за ўсё ў дзейнасці настаўнікаў сустракаюцца наступныя недахопы:

1) адсутнасць сістэмы ў падрыхтоўцы работ (яны выпадковыя і па змесце, і па якасці, і па форме);

2) неадпаведнасць узроўню прапанаваных заданняў і пытанняў для самастойнай працы вучэбным здольнасцям і магчымасцям школьнікаў;

3) непрадуманасць заданняў і пытанняў для самастойнай працы, іх схематычнасць, трафарэтнасць.

Самастойная праца вучняў толькі тады будзе па-сапраўднаму эфектыўнай, калі яна стане сістэмнай: будзе мець месца і на ўступных занятках, і непасрэдна пры вывучэнні твораў, пры правядзенні заключных заняткаў. Абавязковай умовай арганізацыі самастойнай працы школьнікаў павінен быць улік індывідуальных асаблівасцей дзіцяці. Дзякуючы такому падыходу павялічыцца выніковасць самастойнай працы на ўроках літаратурнага чытання, будуць выпрацоўвацца практычныя навыкі работы з тэкстам, развівацца творчыя здольнасці вучняў.



МГПУ им. И.П. Шамякина